# ГАРАЧАЕ ПРЫВІТАННЕ ВЫПУСКНІКАМ УНІВЕРСІТЭТА!

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

**Беларускі УНІВЕРСІТЭТ**

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна

№ 25 (370) | Пятніца, 3 ліпеня 1959 года | Цана 20 кап.



Корпус гуманітарных факультэтаў універсітэта.

## Год карэннай перабудовы

*Цяжка пераацаніць дабрачынныя вынікі перабудовы вышэйшай школы для справы камуністычнага будаўніцтва. У рашэннях XXI з'езда КПСС указвалася, што наша краіна займае першае месца ў свеце па колькасці выпускаемых спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй. Таксама на з'ездзе было прынята рашэнне аб павелічэнні ліку спецыялістаў.*

*У святле гэтых задач і праводзілася карэнная перабудова ўсёй вучэбнай работы Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Зараз ідзе ўзмоцненая падрыхтоўка да новага навучальнага года.*

*Наш універсітэт даў у гэтым годзе 1132 спецыяліста рознага профілю. Радасна адзначыць, што выпуск гэтага года з'яўляецца найбольшым за ўсе гады дзейнасці нашага універсітэта. У народную гаспадарку накіравана звыш сотні хімікаў і каля ста матэматыкаў.*

*Значная частка выпускнікоў накіравана на работу выкладчыкамі сярэдніх школ і спецыяльных навучальных устаноў. Многія выпускнікі фізічнага і матэматычнага факультэтаў накіраваны на работу ў навукова-даследчыя інстытуты і аддзелы АН БССР, вылічальны цэнтр, канструктарскія бюро і лабараторыі заводаў. Установы савецкіх і партыйных органаў, суды і пракуратура атрымаюць нашых гісторыкаў, журналістаў, філолагаў, юрыстаў. Найбольш падрыхтаваная частка выпускнікоў застаецца для вучобы ў аспірантуры універсітэта.*

*Новыя вучэбныя планы прадугледжваюць далейшае паглыбленне тэарэтычнай падрыхтоўкі, пашырэнне профілю выпускаемых спецыялістаў, паляпшэнне іх практычнай падрыхтоўкі.*

*У гэтых адносінах найбольш характэрны планы фізічнага і матэматычнага факультэтаў. Напрамак гэтых планаў наследуе лепшыя традыцыі фізіка-матэматычнай школы, якая створана ў нашым універсітэце.*

*Значна пашыраны аб'ём фізіка-матэматычных дысцыплін і прымыкаючых да іх тэхнічных, якія адлюстроўваюць дасягненні новай тэхнікі.*

*Уведзены новыя курсы па розных сучасных праблемах ядзернай фізікі, аўтаматызацыі вытворчасці, лічыльнай тэхнікі і самой аўтаматыкі.*

*Вучэбныя планы другіх факультэтаў таксама прадугледжваюць значнае паляпшэнне падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў. Яны ставяць сваёй мэтай наблізіць вучобу да жыцця, да вытворчасці, звязаць тэорыю з практыкай. Вучэбны план аддзялення журналістыкі прадугледжвае павелічэнне вытворчай практыкі. Так, замест 12—16 тыдняў, як гэта было раней, адводзіцца 46 тыдняў. На працягу ўсяго 6-га і 8-га семестраў студэнты будуць працаваць у рэдакцыях газет, часопісаў, выдавецтваў, радыёвяшчання і тэлебачання, а вучобу праходзіць па сістэме завочнай і вячэрняй адукацыі.*

*Ажыццяўленне новага вучэбнага плана будзе садзейнічаць таму, што выпускнікі аддзялення журналістыкі ўжо ў сценах універсітэта значна лепш, чым цяпер, будуць падрыхтаваны да самастойнай работы ў друку.*

*У гэтым годзе рэктарат, дэканаты і кафедры амаль на ўсіх факультэтах правялі шэраг мерапрыемстваў па перабудове вучэбнай работы ў адпаведнасці з Законам аб перабудове вышэйшай школы. На якасці вучэбна-выхаваўчай работы дадатна сказаліся перагляд вучэбных графікаў і праграм, ухіленне дубліравання ў выкладанні, узмацненне самастойнай работы студэнтаў.*

*Аднак перабудову вучэбнай работы нельга лічыць закончанай. Выкарыстаны далёка не ўсе магчымасці скарачэння абавязковых заняткаў у аўдыторыях. На некаторых факультэтах не ліквідаваны паралелізм у выкладанні асобных раздзелаў навук.*

*Кожны год наш універсітэт заканчваюць сотні юнакоў і дзяўчат—кваліфікаваных спецыялістаў сваёй справы. Па закліку партыі яны ідуць у жыццё, каб выканаць заданні далейшага развіцця роднай сацыялістычнай Радзімы, савецкай навукі і тэхнікі, культуры. Каб палепшыць іх падрыхтоўку, мы яшчэ больш прыкладзем сіл і намаганняў у кірунку перабудовы вучэбнай работы нашага універсітэта. У гэтым кірунку і вядзецца зараз падрыхтоўка да новага вучэбнага года—першага года карэннай перабудовы вышэйшай школы.*

*Наш універсітэт заўсёды даваў шырокія магчымасці паступаючым юнакам і дзяўчатам стаць высокакваліфікаванымі спецыялістамі. Зараз у новых умовах гэтыя магчымасці яшчэ больш пашыраюцца.*

*Дарагія юнакі і дзяўчаты!*

*Чакаем вас у нашым універсітэце!*

А. Я. Малышаў,
прарэктар па вучэбнай рабоце



Універсітэцкі гарадок.

## Лепшыя выпускнікі



Н. Слагада.



В. Пшанічны.



Б. Яфрэмаў.



І. Шнып.



Л. Канонік.

# НЕ СПЫНЯЙЦЕ ВУЧОБУ

Наўрад ці ёсць неабходнасць гаварыць, што калектыў нашага універсітэта заўсёды жадаў вам, выпускнікам, дзе б вы не знаходзіліся, чэстна, з поўным напружаннем сіл і маладой энергіі працаваць дзеля дабрабыту нашага народа.

Студэнцкія гады. Першыя творчыя пошукі ў выбранні спецыяльнасці. Высокае пачуццё таварыства, якое з'яўляецца характэрным для любога студэнцкага калектыву. Калектыў выхоўвае ў студэнтаў волю і настойлівасць у перададоленні цяжкасцяў, вучыць самааддана служыць інтарэсам народа.

Іменна такі калектыў складалі і зараз складаюць выпускнікі аддзялення рускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Людміла Якубенка, Таісія Мішурная, Людміла Абразцова, Капа Гарланава і Галіна Радзюк. У час вучобы яны стваралі дружную студэнцкую сям'ю. Гэта сям'я не распадзецца і цяпер. І хоць усе яны будуць працаваць настаўнікамі ў розных кутках нашай рэспублікі, парываць сувязі між сабой яны не будуць.

На гэтым здымку вы іх бачыце ва універсітэцкім скверыку ў той момант, калі яны ўжо атрымалі дыпломы і, весела размаўляючы, ідуць па дарожцы скверыка. На развітанне перад пачаткам самастойнага жыцця калектыў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна жадае вам, дарагія таварышы, перш за ўсё—не пераставаць вучыцца, памятаць, што жыццё, праца з'яўляюцца лепшымі настаўнікамі. Вучыцца ў жыцця, у працэсе працы так жа неабходна, як і ў разумных кніг і добрых настаўнікаў.

У добры шлях, сябры!

М. БАНДАРЭНКА.



## В ДОБРЫЙ ЧАС

Уже открыты двери кабинетов,
И в утренних лучах
«Плохие» и «хорошие» билеты
Вздыхают на столах.
Дипломник, «убеленный
сединою»
Изученных наук,
Встречается с «вступительной»
волною
Товарищей-подруг
Студент припоминает «наше
время»,
Одетое в стихи,
И громко начинает: «Здравствуй,
племя!»
Притихли новички.
Но обладатель знаний и диплома
Смущенно замолчал,
Когда среди «младых и незнакомых»
Знакомых увидал!
«Постойте... мы встречались с
вами где-то...
Спецовка... ваш вихор...
Да ведь про вас печатали в
газетах—
Потомственный шахтёр!
А вас я видел на высотном
зданье,
А вас... а вас...»
Дипломник улыбнулся на
прощанье,
«Ну, в добрый час!»

Э. БОНДАРЕВА.

* * *

## Мацнее сувязь вучоных з вытворчасцю

Нядаўна кафедра палітычнай эканоміі правяла сваё чарговае пасяджэнне разам з праўленнем калгаса імя Кастрычніцкай рэвалюцыі Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці.

Калгаснікі былі вельмі зацікаўлены прачытанымі дакладамі. На апошнім пасяджэнні дацэнт А. І. Мальцаў зрабіў даклад «Аб пераходзе на грашовую аплату працы ў калгасах». Выступіў таксама загадчык кафедры дацэнт У. А. Тамашэвіч, які падкрэсліў значэнне сувязі вучоных універсітэта з калгасным сялянствам. У гэтым пасяджэнні актыўны ўдзел прынялі дацэнты В. М. Аляксееў і ст. выкладчык І. Ц. Васілеўскі. Многія члены кафедры і раней бывалі ў калгасе, знаёміліся з гаспадаркай, чыталі лекцыі, дапамагалі парадамі. Напрыклад, дацэнт Ф. В. Баравік прымаў удзел у складанні плана на сямігодку. Такая сувязь вучоных з калгасам з году ў год мацнее.

Старшыня калгаса т. Куліноўскі, аграном т. Верашчага, брыгадзір трактарнай брыгады т. Лічко, брыгадзір паляводчай брыгады т. Станішэўскі, загадчык аддзела культуры Дзяржынскага райвыканкома т. Пінскі, якія выступілі на пасяджэнні, падкрэслівалі значэнне сувязі вучоных з калгасам, гаварылі аб эканамічным значэнні вырошчвання кукурузы, росце механізацыі, аб паляпшэнні дысцыпліны ў калгасе. Такія нарады вучоных з сельскімі працаўнікамі трэба практыкаваць і ў далейшым.

На пасяджэнні прысутнічала звыш 140 чалавек.

М. А. ЯРАВІКОЎ,
загадчык кабінета палітэканоміі.

КОЖНЫ СТУДЭНТ АДПРАЦУЕ НА БУДАЎНІЦТВЕ УНІВЕРСІТЭТА 48 ГАДЗІН АЛЬБО ВЫПРАЦУЕ 15 ПРАЦАДЗЁН

## СТУДЭНТЫ ПАМНАЖАЮЦЬ ПРАЦОЎНЫЯ ТРАДЫЦЫІ

Поспехамі ў вучобе, новымі дасягненнямі ў працы сустрэлі студэнты нашага універсітэта Дзень савецкай моладзі. Яны заўсёды ішлі ў першых радах беларускай моладзі. Дастаткова ўспомніць мінулы год, калі ЦК ВЛКСМ звярнуўся з заклікам дапамагчы ва ўборцы цаліннага ўраджаю. Сотні заяў пасыпаліся ў камітэт камсамола. Юнакі і дзяўчаты адмовіліся ад спакойнага жыцця пад матчынай апекай у час летніх канікулаў, паехалі за тысячы кіламетраў ад Беларусі і там, на казахстанскіх прасторах, заваявалі працоўную славу нашаму універсітэту. Прызнаннем іх поспехаў з'яўляюцца Ганаровыя граматы ЦК ВЛКСМ і ЦК камсамола Казахстана, якімі ўзнагароджана камсамольская арганізацыя універсітэта. Гэтымі днямі ў камітэт камсамола дасланы граматы ЦК ВЛКСМ, якімі ўзнагароджаны за добрасумленную працу на цаліне студэнты Э. Шпілеўскі, І. Шаўчэнка, А. Фурык, У. Коўган, В. Глазкова, З. Яраш.

І калі зараз ужо ўзвышаюцца 4 паверхі галоўнага корпуса універсітэта, дык у гэтым немалая заслуга і нашых студэнтаў, якія на працягу ўсяго другога семестра сістэматычна дапамагалі будаўнікам. Добра папрацавалі на будаўніцтве 3-ці і 4-ы курсы аддзялення рускай мовы і літаратуры, першыя курсы юрыдычнага, геаграфічнага і біялагічнага факультэтаў, 4-ы курс гістарычнага факультэта. Камсоргі, прафоргі і старасты груп змаглі арганізаваць студэнтаў на выдатнае выкананне заданняў грамадскіх арганізацый. За старанную працу на будаўніцтве студэнтам М. Дабрыян, Л. Куляшэўскай, Н. Вяргейчык, М. Ванагель, Т. Жук, А. Міклушу, Г. Новік, Г. Пракаповіч, Л. Прышчэп, М. Лушчыніну аб'яўлена падзяка рэктарата.

Гарацьь жаданнем паехаць на ўборку цаліннага ўраджаю ў гэтым годзе студэнты І курса хімічнага факультэта А. Абражэвіч, Т. Ярмолава, Л. Ларчанка, Г. Карчэўская, І. Ласкоў. Увесь 2 курс журналістаў выявіў жаданне працаваць на Полацкай альбо Старобінскай новабудоўлях. Дзесяткі юнакоў і дзяўчат прыходзяць штодзённа ў камітэт камсамола, каб атрымаць камсамоль-

(Заканчэнне на 4 стар.)

## ЛЕПШЫЯ



Р. Каспяровіч.



М. Сіляева.



В. Спрынджук.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

# Партыйная арганізацыя і актыў

ПАРТЫЙНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ матэматычнага факультэта не з'яўляецца мнагалікай. Таму, каб ахапіць сваім уплывам кожнага студэнта, яна павінна абапірацца на баяздольны выкладчыцкі і студэнцкі актыў.

З пачатку вучэбнага года партбюро факультэта прыкладала ўсе намаганні да таго, каб стварыць добры студэнцкі актыў, які б змог весці за сабой студэнцкія масы. Справа ў тым, што ў папярэднія гады некаторыя актывісты-студэнты, выбраныя ў склад кіруючых камсамольскіх і прафсаюзных органаў, на справе з'яўляліся не актывам, а пасівам. Яны дрэнна вучыліся і не з'яўляліся прыкладам у паводзінах. У іх была нізкая патрабавальнасць да сябе і, такім чынам, не магло быць высокай патрабавальнасці і да другіх.

Так, у адной з груп цяперашняга 4 курса камсоргам двойчы (адпаведна на 2 і на 3 курсах) выбіраўся адзіны непаспяваючы ў групе студэнт, які зараз займаецца на завочным факультэце.

Некаторыя камсоргі на тым жа курсе не маглі нават уявіць сабе, што ім неабходна ўдзельнічаць у многіх мерапрыемствах. Сакратар курсавога бюро «забываў» прыходзіць на факультэцкія камсамольскія сходы. Многія камсамольцы здзіўляліся, калі ставілася пытанне аб перадачы на разгляд факультэцкага бюро тых, хто не з'яўляецца на сходы, і галасавалі супроць такой прапановы.

У перыяд падрыхтоўкі і правядзення справаздачна-выбарчай кампаніі ў прафсаюзных і камсамольскіх органах партбюро правяло вялікую растлумачальную работу, накіраваную на тое, каб у склад кіруючых органаў былі выбраны сапраўды дастойныя людзі, якія заслугоўваюць давер'я студэнцкага калектыву.

Трэба адзначыць, што пераважна большасць выбраных камсамольскіх і прафсаюзных актывістаў цяпер з'яўляюцца прыкладнымі ў вучобе і грамадскай рабоце. Толькі на выдатна займаюцца члены камсамольскага бюро факультэта П. Манастырны (3 курс), член курсавога бюро А. Барташэвіч (1 курс), камсорг групы В. Самусева. і інш. Мае добрыя і выдатныя адзнакі сакратар камсамольскага бюро факультэта М. Варын.

Аднак яшчэ нельга сказаць, каб камсамольскі і прафсаюзны актыў у поўным складзе займаў авангардную ролю ў вучобе і быў прыкладам у паводзінах. Напрыклад, былы камсорг першай групы 3 курса т. Чыгір у мінулую зімовую экзаменацыйную сесію атрымаў нездавальняючую адзнаку, сакратар камсамольскага бюро 2 курса Гатальскі быў вызвалены ад абавязкаў сакратара за грубыя адносіны да студэнтаў

Сярод старост былі таксама і такія, што прапускалі заняткі без уважлівых прычын і атрымалі нездавальняючыя адзнакі ў зімовую сесію (т. т. Кулыша—1 курс, Сяжантр—1 курс, Плешчанкаў—2 курс). У другім семестры гэтыя старасты былі заменены іншымі, добра паспяваючымі студэнтамі. Галоўным старастам і старастам I групы стаў камуніст М. Ганчароў, які прышоў ва універсітэт пасля службы ў радах Савецкай Арміі. Ён займаецца на «добра» і «выдатна», акуратна наведвае заняткі і добрасумленна вядзе ўлік наведвання заняткаў студэнтамі

Вялікую работу па выхаванню студэнтаў праводзяць выкладчыкі, якія замацаваны за групамі. У акадэмічных групах першых чатырох курсаў у сёлетнім вучэбным годзе працуе 15 чалавек з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу, сярод якіх 7 дацэнтаў і 8 асістэнтаў. 4 выкладчыкі з'яўляюцца членамі КПСС (Ц. А. Базылеў, Т. Ф. Каванава, А. Н. Нахімоўская, І. Ц. Рагоўскі).

Партыйнае бюро падтрымлівала пастаянную сувязь з выкладчыцкім і студэнцкім актывам, накіроўвала яго работу і ажыццяўляла кантроль за ім.

Найбольш распаўсюджанай формай сувязі партыйнай арганізацыі і актыву з'яўляюцца наступныя: запрашэнне актыву на адкрытыя партыйныя сходы і пашыраныя пасяджэнні партбюро, правядзенне нарад актыву па адпаведных пытаннях, наведванне членамі партбюро і членамі КПСС камсамольскіх і прафсаюзных сходаў, пасяджэнняў прафбюро і камсамольскіх бюро, вечароў адпачынку і іншых грамадскіх мерапрыемстваў, асабістая гутарка членаў партбюро і членаў КПСС з асобнымі актывістамі па розных пытаннях. Напрыклад, актыў запрашаўся на адкрытыя партыйныя сходы, дзе абмяркоўваліся пытанні «Тэзісы даклада М. С. Хрушчова на XXI з'ездзе КПСС», «Аб падрыхтоўцы да зімовай экзаменацыйнай сесіі», «Аб стане і мерах паляпшэння палітыка-выхаваўчай работы сярод студэнтаў», «Пастанова ЦК КПСС аб ахове грамадскага парадку», «Аб рабоце камсамольскай арганізацыі факультэта». Камсамольскі і прафсаюзны актыў запрашаўся на пасяджэнне партбюро для абмяркоўвання пытанняў аб рабоце камсамольскай арганізацыі 1 курса, аб рабоце прафбюро факультэта, аб развіцці фізкультуры і спорту і г. д.

Выкладчыкі, замацаваныя за групамі, таксама больш цікавяцца пытаннямі ўдзелу студэнтаў у грамадскіх мерапрыемствах. У прыватнасці, імі праводзілася работа па ўцягненню студэнтаў у дружыны па ахове грамадскага парадку. Тут асабліва трэба адзначыць дацэнта А. М. Родава, у групе якога амаль усе студэнты ўступілі ў дружыну.

Партбюро турбавалася аб тым, каб студэнты пятага курса актыўна ўдзельнічалі ў грамадскім жыцці. Студэнты пятага курса прыцягваліся да правядзення агітацыйнай работы сярод насельніцтва ў перыяд выбараў у мясцовыя Саветы і Вярхоўны Савет БССР.

**А. Гусак,**
**сакратар партыйнай арганізацыі матфака.**

# Навінкі літаратуры, што паступілі ў бібліятэку БДУ

**Жданов, Ю. А., Ленин и естествознание.** М. Дзяржпалітвыдавецтва, 1959, 111 стар.

На прыкладах з розных галін прыродазнаўства ў кнізе паказана, як працы У. І. Леніна па філасофіі асвятлялі прыродазнаўцам шлях пазнання прыроды. Раскрываецца значэнне прац У. І. Леніна для развіцця сучаснага прыродазнаўства, для барацьбы супраць рэлігіі і ідэалізма.

**О «Философских тетрадях» В. И. Ленина.** Калектыў аўтараў Інстытута філасофіі АН БССР і філасофскіх кафедраў БДУ імя У. І. Леніна. М. Сацэквыдавецтва. 1959.

Аналізуючы багаты матэрыял «Філасофскіх сшыткаў», аўтары грунтоўна паказваюць, які вялікі ўклад унёс У. І. Ленін у распрацоўку пытанняў гістарычнага матэрыялізма, філасофскіх пытанняў прыродазнаўства і гісторыі філасофіі.

Кніга разлічана на студэнтаў, аспірантаў, выкладчыкаў ВНУ, навуковых супрацоўнікаў, прапагандыстаў.

**Ай Сы-ци. Лекции по диалектическому материализму.** (Пераклад з кітайскага). М. Дзяржпалітвыдавецтва, 1959.

У кнізе дадзена сістэматычнае выкладанне дыялектычнага матэрыялізма. Для ілюстрацыі тэарэтычных палажэнняў аўтарам прыцягнуты багаты і цікавы матэрыял з жыцця Кітая; паказана цесная сувязь марксісцкай філасофіі з практыкай. Кніга разлічана на выкладчыкаў, студэнтаў, прапагандыстаў і ўсіх, хто цікавіцца пытаннямі марксісцкай філасофіі.

**Эшби, У. Р. Введение в кибернетику.** (Пераклад з англійскай мовы. М. Выдавецтва замежнай літаратуры, 1959.

Добра напісаныя і разлічаныя на шырокія колы чытачоў уводзіны ў розныя пытанні кібернетыкі.

Кніга разлічана на матэматыкаў, біёлагаў і вучоных іншых спецыяльнасцей, якія цікавяцца пытаннямі кібернетыкі.

**Цапенко, М. М. и Махнач, И. А. Антропогеновые отложения Белоруссии.** Мінск, АН БССР, 1959.

У кнізе коратка выкладзены даныя пабудавання чацвярцічнай тоўшчы Беларусі, міжледавікоўя, фауны і палеаграфіі антрапагена.

Кніга разлічана на шырокія колы спецыялістаў-геолагаў, геамарфолагаў, географаў, геабатанікаў, глебазнаўцаў і інш. Акрамя таго, яна можа быць выкарыстана ў якасці дапаможніка на геалагічных, глебавых, біялагічных і геаграфічных факультэтах ВНУ.

БІБЛІЯТЭКА.

# ВЫПУСКНІКІ



Л. Гладчанка.



Р. Барадулін



У. Левы.

## Спорт

# НАШ СПАРТЫЎНЫ ЛАГЕР

СПАРТЫЎНЫ КЛУБ універсітэта разам з кафедрай фізвыхавання і прафсаюзнай арганізацыяй арганізаваў у час летніх канікулаў на базе Навапольскага сельскагаспадарчага тэхнікума аздараўленча-спартыўны лагер на 150 чалавек.

Вопыт мінулага года паказаў, што такі лагер з'яўляецца лепшай формай арганізацыі культурнага і здаровага адпачынку студэнтаў. У ім прадугледжаны вучэбна-трэніровачныя заняткі, турысцкія паходы, плаванне, спаборніцтвы па розных відах спорту і розныя культурныя мерапрыемствы.

Навапольскі сельскагаспадарчы тэхнікум мае ўсё неабходнае для вырашэння задач, якія стаяць перад аздараўленча-спартыўным лагерам.

Ён размяшчаецца ў маляўнічай мясцовасці ў 32 км ад горада Мінска. Дырэкцыя тэхнікума перадае для лагера каменны двухпавярховы інтэрнат на 150 месц, клуб з кіназалай на 300 месц, бібліятэку, сталовую, спартыўныя пляцоўкі і шэраг іншых дапаможных памяшканняў. Будынкі тэхнікума электрыфікаваны і радыёфікаваны.

Недалёка ад лагера маецца штучнае возера, дзе можна з поспехам праводзіць заняткі па плаванню.

Рэктарат універсітэта выдзяляе для арганізацыі лагера пасцельныя рэчы і аўтамашыну. Усю вучэбна-трэніровачную работу будуць праводзіць выкладчыкі кафедры фізвыхавання.

Кошт пуцёўкі на 24 дні вызначаны ў суме 350 рублёў, прычым студэнт плаціць толькі 150 рублёў, а астатнюю суму даплачвае прафсаюзная арганізацыя.

У цяперашні час прафком і спартыўны клуб, а таксама секцыі па розных відах спорту працягваюць запісваць студэнтаў, якія жадаюць правесці свой летні адпачынак ва універсітэцкім аздараўленча-спартыўным лагеры.

**М. Шэйнеман,**
**старшыня спартклуба універсітэта.**

# НАША ПАДЗЯКА

**Закончыўшы ўніверсітэт, хочацца ад імя групы выпускнікоў гістарычнага аддзялення завочнага факультэта падзякаваць супрацоўнікам чытальнай залы універсітэта за добрае абслугоўванне падручнікамі і літаратурай сваіх наведвальнікаў. Гэты зладжаны калектыў сваімі чулымі і сціплымі адносінамі да студэнтаў-завочнікаў заваяваў усеагульную павагу. Сваёй стараннасцю асабліва вызначаюцца тт. Гарахоўская, Ляховіч. Наогул, увесь калектыў добра ведае сваю справу, любіць яе. Жадаем ім і надалей вялікіх поспехаў у працы і асабістым жыцці.**

**А. ЛЕАНОВІЧ,**
**П. ДАЎГУЧЫЦ.**

# *Лепшыя выпускнікі*



*М. Лісавенка.*



*Г. Нікалаева.*



*А. Ельніцкі.*



*У. Міхалковіч.*



*В. Васільева.*

